**Грыгор’еў, А.** Так стваралася брыгада / А. Грыгор’еў // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 1984. – 6 сак. – С. 2.

## ТАК СТВАРАЛАСЯ БРЫГАДА

У чэрвені 1942 года загадам па брыгадзе «За Савецкую Беларусь» для арганізацыі партызанскага руху ў Дрысенскі раён была накіравана штабная група, у якую уваходзілі П. Р. Мандрыкін і Г. П. Герасімаў. Атрымалася так, што група трапіла ў распалажэнне Расонскай партызанскай брыгады, якую ўзначальваў Ахоцін. Праз сакратара падпольнага райкома Лапенку была наладжана сувязь з членамі тэрытарыяльнай пярвічнай партыйнай арганізацыі Бараноўскім, Варашылавым, Шамшурам, Касачом, Бяляевым і Арлоўскім. Ім было даручана падрыхтаваць партыйна-камсамольскую канферэнцыю, якая і адбылася 20 ліпеня гэтага ж года.

Непадалёк ад вёскі Сабачына сабраліся камуністы і камсамольцы Юзэфоўскага, Галубаўскага, Дзёрнавіцкага, Валынецкага сельсаветаў. На канферэнцыі прысутнічала 19 членаў партыі і 16 камсамольцаў. Старшынёй прэзідыума выбралі Фёдара Шаблоўскага, сакратаром В. Арлоўскага. На парадку дня стаяла вострае пытанне: актывізацыя партызанскага руху на Дрысеншчыне.

Перад прысутнымі выступіў прадстаўнік ЦК КПБ Пётр Раманавіч Мандрыкін. Яго кароткая прамова была пранізана гарачай нянавісцю да нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія прынеслі на нашу зямлю кроў і сірочыя слёзы, руіны і папялішчы. Не даваць ворагу спакою ні днём, ні ноччу, бязлітасна знішчаць чужынцаў – у гэтым бачыў кожны з выступаючых сэнс свяшчэннай барацьбы.

Створаныя на канферэнцыі Дрысенскі падпольны раённы камітэт партыі ўзначаліў Георгій Паўлавіч Герасімаў, падпольны райком камсамола – В. Бохан.

Праз чатыры дні, 24 ліпеня, у раён вёскі Смалаўкі сталі сцякацца групы ўзброеных людзей. За два дні сабралася звыш 370 чалавек. Яны і стварылі 1-ую Дрысенскую партызанскую брыгаду, камандзірам якой стаў Пётр Мандрыкін, камісарам – Георгій Герасімаў.

Дзякуючы вялікай палітыка-масавай рабоце, праведзенай падпольлным райкомам партыі сярод насельніцтва, да канца верасня ў брыгадзе налічвалася сем атрадаў, аб’ядноўваючых 2700 чалавек: імя Суворава, імя Кірава, імя Неўскага, імя Калініна, імя Леніна, КІМ і «Бясстрашны». Камандзірамі былі прызначаны І. Собалеў, І. Габелка, В. Гардзей, І. Кухарэнка, С. Дзеліжонак, І. Галубкоў, Бубін.

Для стварэння пярвічных партарганізацый у арганізаваныя атрады накіравалі загартаваных камуністаў Шамшура, Бяляева, Кралько. У распараджэнне штаба брыгады былі адкамандзіраваны П. Мацкевіч і Ф.Шаблоўскі. Яны займаліся палітычным выхаваннем партызан.

**А. ГРЫГОР’ЕЎ,**

**былы камандзір**